**Вучэбная дысцыпліна “Гісторыя беларускай літаратуры”**

| | |
|---|---|
| **Месца дысцыпліны ў структурнай схеме адукацыйнай праграмы** | Адукацыйная праграма бакалаўрыяту<br>(І ступень вышэйшай адукацыі)<br>Спецыяльнасць: 6-05-0321-01 Журналістыка<br>Дзяржаўны кампанент<br>Модуль “Літаратурны працэс і соцыум” |
| **Кароткі змест** | Старажытная літаратура. Перыядызацыя. Перакладная і арыгінальная літаратура. Праблематыка і жанравая спецыфіка літаратуры ўсходніх славян. Станаўленне уласнабеларускай літаратуры. Летапісы і хронікі часоў ВКЛ. Беларускі Рэнесанс і яго прадстаўнікі. Літаратура перыяду Рэфармацыі і Контррэфармацыі. Літаратура XVII–XVIII стст. Барока, класіцызм, асветніцтва ў Беларусі. Сілабічная паэзія. Станаўленне тэатра. Школьная драматургія. Гісторыка-мемуарная проза. Літаратура XIX стагоддзя. Грамадска-палітычныя ўмовы станаўлення новай беларускай літаратуры. Перыядызацыя. Метады і літаратурныя кірункі. Ананімная літаратура. Праблема польска-беларускага двухмоўя. Рускамоўныя творы. Літаратура XX стагоддзя.. “Нашаніўскі” перыяд і яго дзеячы. Фарміраванне сучаснай сістэмы жанраў. Развіццё літаратурна-эстэтычнай думкі. Узаемадзеянне розных творчых метадаў. Грамадска-культурнае жыццё Беларусі ў 1920-я і 1930-я гг. Пошукі новага зместу і формы. Літаратурныя аб’яднанні. Дыскрэтнасць літаратурнага працэсу 1930–1940-х гг. Літаратура перыяду Вялікай Айчыннай вайны і першага пасляваеннага дзесяцігоддзя. Праблемна-тэматычнае, жанрава-стылёвае абнаўленне і ўзбагачэнне літаратуры ў 1960–1980-я гг. Асаблівасці сучаснага літаратурнага працэсу. Новыя тэндэнцыі ў развіцці літаратуры на мяжы XX–XXI стст. |
| **Фарміруемые кампетэнцыі, вынікі навучання** | Базавыя прафесійныя кампетэнцыі: ***ведаць:*** творчасць класікаў нацыянальнай літаратуры; этапныя мастацкія тэксты; розныя этапы развіцця беларускай літаратуры, яе асноўныя напрамкі, плыні і мастацкія метады; асноўныя заканамернасці, ***умець:*** прымяняць веды аб дасягненнях сусветнай і айчыннай культуры і літаратуры ў працэсе стварэння медыятэксту ***валодаць***: методыкамі аналізу мастацкага тэксту; методыкай сістэматызацыі і структурыравання з’яў літаратурнага працэсу. |
| **Прэрэквізіты** | Гісторыя замежнай літаратуры. Гісторыя рускай літаратуры. |
| **Працаёмкасць** | 6 заліковых адзінак. Агульная колькасць гадзін – 220; аўдыторных гадзін – 104, у тым ліку лекцыйных – 48 гадзін, практычных – 56 гадзін. |
| **Семестр(ы), патрабаванні і формы бягучай і прамежкавай атэстацыі** | 3 семестр залік, 4 семестр экзамен, калоквіум, тэст. |